**Паўлава А.Я.**

# ІЛЮСТРАВАНЫЯ ПАШТОЎКІ ЯК СРОДАК ВЫВУЧЭННЯ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ГІСТАРЫЧНАЙ І КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

*Ключавыя словы:* ілюстраваныя паштоўкі, культурная спадчына, выстаўкі, музеі, прыватныя калекцыі, сувеніры

Пад культурнай спадчынай прынята разумець матэрыяльную і нематэрыяльную частку культуры, створаную мінулымі пакаленнямі і ўспрымаемую грамадствам як нешта каштоўнае і шануемае, крыніцу ведаў і каштоўнасцяў для будучых пакаленняў. Адпаведна, вынікаюць два аспекта культурнай спадчыны: творчы – жывая культура, і гістарычны, які прадугледжвае вывучэнне і захаванне аб'ектаў і твораў. Гісторыя выдання паштовак на тэрыторыі Беларусі набліжаецца да 150 гадоў, а самі карткі спалучаюць у сабе абодва аспекты культурнай спадчыны і па слушнай заўваге акадэміка Д.С. Ліхачова з'яўляюцца "візітнымі карткамі часу".

Політэматычнасць і поліфункцыянальнасць паштоўкі, разам з фактарам паўсюднага бесперапыннага бытавання, судзейнічалі заняццю адкрытымі лістамі асаблівага месца ў шэрагу рэпрэзентатыўных візуальных артэфактаў канца новай і ўсяго перыяду найноўшай гісторыі. У кантэксце вывучэння азначанай тэмы асаблівую цікавасць уяўляюць ілюстраваныя паштоўкі. Гэта паштовыя карткі, на адным або двух баках якіх размешчаны выявы – фатаграфіі відаў населенных пунктаў і людзей, рэпрадукцыі карцін, малюнкі або іншыя мастацкія творы. Яны могуць быць як мастацкімі (з творамі мастацтва), так і дакументальнымі. Пад тэрмінам "дакументальная паштоўка" або "фотапаштоўка" або "краявідная паштоўка" маецца на ўвазе разнавіднасць паштовых картак, у аснову выяў на якіх пакладзены фатаграфіі. Усе ілюстраваныя паштоўкі могуць выконваць функцыю сувеніраў, форм культурна-адукацыйных матэрыялаў, віншаванняў і г.д. [6].

Паштоўкі служаць магутным інструментам прасоўвання і захавання культурнай спадчыны: яны дазваляюць папулярызаваць гістарычныя помнікі, мастацтва, традыцыі і звычаі, робячы іх даступнымі і зразумелымі для шырокай аўдыторыі. Паштовыя карткі не проста спрыяюць пазнаванню славутасцяў, іх папулярнасці, але і замацаванню ў свядомасці, што менавіта гэтыя будынкі або аб'екты з'яўляюцца найбольш выбітнымі сярод іншых падобных.

Значныя зборы філакартыі знаходзяцца ў музейных установах. Большасць паштовак у музеях – краявідныя [2; 3]. З 9.5 тысяч паштовак у Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі у кантэксце тэмы спадчыны цікавасць выклікаюць паштоўкі пачатку XX ст. з відамі гарадоў і мястэчак і фотакарткі У. Суцягіна. З 10 тысяч прадметаў філакартыі ў фондах Віцебскага краязнаўчага музея каля 300 складаюць ілюстраваныя карткі з відамі Віцебска пачатку XX ст. [8]. Калекцыя філакартыі ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі начала фарміравацца ў 1976 г. і на сёняшні дзень складае больш за 8 тысяч прадметаў асноўнага фонду [3]. Музейная калекцыя паштовак у Лідскім гісторыка-мастацкім музее перавышае 1000 адзінак, з якіх 230 – гэта крявідныя паштоўкі г. Ліды у першай палове XX ст. [21]. У фондах Музея гісторыі г. Мінска з 672 паштовак маюць дачыненне да культурнай і гістарычнай спадчыны толькі 66 краявідных паштовак і 2 паштоўкі – рэпрадукцыі карцін М. Савіцкага.

Прыватныя калекцыянеры Беларусі маюць велізарную колькасць рэдкіх артэфактаў мінулага, патэнцыял якіх неабходна выкарыстоўваць у поўнай меры ў кантэксце дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Варта адзначыць, што паштоўкі з музейных збораў і прыватных збораў не ўключаны ў склад Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым асабліва

важным становіцца ўзаемадзеянне музейных установ з прыватнымі калекцыянерамі ў сферы арганізацыі выстаў паштовак на базе музеяў.

Каля 500 паштовак з рэпрадукцыямі работ Марка Шагала сабраў віцебскі краязнаўца А.М. Падліпскі [1]. Улічваючы заўвагу самога мастака, што на ўсіх карцінах прысутнічаюць фрагменты Пакроўскай вуліцы, кожная паштоўка з рэпрадукцыяй палотнаў майстра набывае падвойную значнасць у кантэксце вывучаемай тэмы. Убачыць паштоўкі магчыма падчас выстаў, якія арганізуюцца Віцебскім абласным краязнаўчым музеем сумесна з калекцыянерам.

Збор У.А. Ліхадзедава ўтрымлівае больш за 50.000 філакартычных рарытэтаў, з якіх 35.000 паштовак і фота прысвечаны Беларусі. Гісторыка-асветніцкі праект «У пошуках страчанага» нарадзіўся ў 2004 годзе на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня». За ажыццяўленне праекта ўжо ў 2006 годзе У.А. Ліхадзедаў стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» за 2006 год. На працягу 20 гадоў У.А. Ліхадзедавым былі праведзены каля 100 тэматычных выстаў у Беларусі і за мяжой. Паспяховым стала выданне 50 фотаальбомаў паштовак (праект “Бацькаўшчына. У пошуках страчанага”, серыя “Падарожжа ў часе”) [7; 12]. У рамках праекта выдадзены камплекты “Прывітанні” пад заклікам “Збірай паштоўкі і вывучай гісторыю разам с праектам “У пошуках страчанага”, якія ўзнаўляюць паштоўкі пачатку XX стагоддзя – краявіды Мінска, Слоніма і Гродна. У 2023 г. адбылася прэзентацыя сумеснага гісторыка-асветніцкага праекта Міністэрства інфармацыі і У. Ліхадзедава «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага». Сімвалам праекта стала "стужка часу Бацькаўшчыны", упрыгожаная традыцыйнымі ўзорамі беларускага арнаменту, размешчаная на кожнай паштоўцы [16]. Асаблівым складнікам праекта стаў набор з 30 паштовак “Нястрачаная спадчына”, дзе пад адной вокладкай аб’яднаны карткі са знакавымі помнікамі архітэктуры Беларусі, тэатры, музеі, а таксама сучасныя адукацыйныя установы сферы культуры.

У 2022 г. у музейнай прасторы Музея гісторыі горада Мінска з фондаў і Літаратурнага музея М.Багдановіча і прыватных калекцый паспяхова зладзілі выстаўку “Гарадскі праменад. Мінск на старых паштоўках” [9]**.** У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь каля года дзейнічае выставачны праект “1000 рарытэтаў Беларусі “Я Вам пішу…”, створаны на аснове калекцыі У.А. Ліхадзедава.

Некалькі электронных праектаў серыі “Мір паштоўкі” прэзентаваны ў рамках супрацоўніцтва паміж ДУ “Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь” і ДУ “Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь” на сайце Презідэнцкай бібліятэкі. Праект “Маршрутамі Беларусі”, створаны на аснове паштовак з фонда бібліятэкі, у 2022 г. пазнаёміў наведвальнікаў сайта з гістарычнымі славутасцямі г. Магілёва. Да Дня горада Мінска размесцілі прэзентацыю пра сталіцу на аснове калекцыі паштовак серыі выдавецтва У. Шаркова “З Мінска з любоўю” [17].

Безумоўным фаварытам малюнкаў на ілюстраваных паштоўках на мяжы XIX–XX стагоддзяў і ў цяперашні час з’яўляюцца помнікі архітэктуры. Іх папулярызацыі спрыяла развіццё турызму і патрэба падарожнікаў адпраўляць краявідныя паштоўкі сваім сябрам і блізкім ці набываць краявідныя паштоўкі ў якасці сувеніра аб прыемных успамінах. Краявідныя карткі “залатога перыяда” выкарыстання паштовак шырока прадстаўлены ў выданнях, падрыхтаваных А.М. Вялічка, У.А. Ліхадзедавым і А.М. Падліпскім.

Сярод набораў паштовак звяртае на сябе ўвагу камплект пра помнікі архітэктуры Беларусі, створаны па малюнках мастака-графіка І.В.Мядзведзевым. Першае выданне гэтага набору ў 1957 г.захавалася ў фондзе пісьменніка У.С. Караткевіча [14]. У прыватных калекцыях захаваўся ў 1992 г. выдавецтвам “Беларусь” набор мастацкіх паштовак пра помнікі архітэктуры Беларусі, створаных дэканам мастацкага факультэта Беларускай акадэміі мастацтваў і старшынёй Саюза мастакоў Беларусі В.С. Басалыгам.

У сучаснай Беларусі выдадзены камплекты фотапаштовак з помнікамі архітэктуры Беларусі, сярод якіх можна адзначыць “Архітэктура Беларусі” (фатографы У. Суцягін і В. Шуба); “Мірскі замак” (фатограф А. Фралоў, прадмова – А. Трусаў), “Беларусь турыстычная. Золатая калекцыя” (фатограф і аўтар прадмовы К. Сакалоў) [18]. У кантэксце тэмы актуалізацыі спадчыны варта прыгадаць камплект “Старажытныя гарады Беларусі. Полацк”. Фотаздымкі С.М. Плыткевіча знаёмяць гасцей самага старажытнага беларускага горада з гістарычным цэнтрам Полацка [19]. Серыю працягнуў набор паштовак пра Гродна. На паштоўках павялічанага фармату на адваротным баку прадстаўлена апісанне і гісторыя стварэння помнікаў, разам з шэдэўрамі сакральнай архітэктуры, на паштоўках прадстаўлены Стары і Новы замкі ў Гродна, Тэатр Тызенгаўза і музей Э. Ажэшкі ў Гродне, а таксама – помнікі князю Усяславу Брачыславічу, Еўфрасінні Полацкай, Сімяону Полацкаму, Полацкім купцам, літары “Ў” .

Гаворачы аб першых мастацкіх паштоўках з беларускімі краявідамі, варта прыгадаць карткі, створаныя ў 1860-я гг. па рэпрадукцыях “Беларускіх малюнкаў” М. Мікешына. Сёння гэта традыцыя працягваецца – яскравым прыкладам можна назваць мастацкую картку Р. Федасенка з выявай уключанага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны маёнтка Бішэўскіх у Лынтупах.

Адной з разнавіднасцяў ілюстраваных паштовак сталі «Прывітанні», на якіх часцей за ўсё размяшчалі выявы вакзалаў, гістарычных помнікаў і храмаў, цэнтральных вуліц, набярэжных і мастоў. У 2010-х гадах для турыстычнага посткросінгу у Беларусі адрадзілі традыцыю выдання паштовак-прывітанняў з размяшчэннем на іх выключна помнікаў архітэктурнай спадчыны (адзін або адразу некалькі аб’ектаў). Зараз у нас у краіне выдаецца 2 віды такіх графічных паштовак – уласна “Прывітанне з Беларусі!” з выявамі славутасцяў канкрэтнага горада, ці “Запрашаем!” з наступным удакладненнем абласнога цэнтра [10]. Вялікую калекцыю маляваных у тэхніцы акварэлі прывітанняў са сталіцы Беларусі, на якіх намаляваны асноўныя славутасці, падрыхтавала выдавецтва У. Шаркова ў серыі “Краявіды”.

Наборы паштовак-рэпрадукцый твораў беларускіх мастакоў актыўна выдаюцца з савецкіх часоў. А ў 1986 г. выдавецтва “Беларусь” выпусціла камплект паштовак з фотаздымкамі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з фондаў Музея беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах [15, с. 68–73]. У сувенірнай краме Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі наведвальнікам прапануюцца паштоўкі з рэпрадукцыямі твораў Ф. Рушчыца, Я. Драздовіча, В. Цвіркі, М. Данцыга, У. Кудрэвіча, П. Масленнікава, Ю. Пэна.

У кантэксце папулярызацыі літаратурнай спадчыны звяртае на сябе ўвагу выпушчаны ў 1962 г. набор паштовак, дзе творы Я. Купалы праілюстраваны працамі беларускага графіка А. Кашкурэвіча [14]. У наш час Аршанскім музеем У.С. Караткевіча выданы камплект паштовак “Мясціны Уладзіміра Караткевіча ў Оршы”. У Барысаўскай бібліятэцы імя І.Х. Каладзеева пад грыфам “Культурная сталіца Беларусі” у 2021 г. мастаком бібліятэкі А. Мірзаянам была створана лімітаваная “літаратурная серыя” аўтарскіх паштовак [20]. Традыцыю папулярызацыі этнаграфічнай спадчыны на паштоўках сёння працягваюць карткі фатографа Дз. Раманюка. У перыяд правядзення выставы “Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм” Нацыянальны мастацкі музей падрыхтаваў сувенірныя паштоўкі мастацкія і паштоўкі на аснове экспедыцыйных фатаграфій М.Ф. Раманюка з выявамі строяў рэгіёнаў рэспублікі, а таксама прыклады ўзораў вышыўкі.

Для Беларусі тэма мемарыялізацыі гераічнай барацьбы працягвае заставацца актуальнай. Яшчэ у савецкі час з’явіліся першыя камплекты паштовак “Брэсцкая крэпасць-герой”, у калекцыі У. Ліхадзедава захаваліся паштоўкі з тэкстамі песень У. Алоўнікава “Лясная песня” і “Песня пра Заслонава”. Увасабленне тэмы мемарыялізацыі падзей вайны, мемарыяльны комплекс “Курган Славы”, стаў сэнсавым цэнтрам карціны П.В. Масленікава “Зямля беларуская”. Да 80-годдзя вызвалення

Беларусі былі выдадзены наборы фотапаштовак С. Плыткевіча "Мы памятаем! Вялікая Айчынная вайна. 1941–1945" [11].

На мяжы XX–XXI стагоддзяў паштоўкі сталі мініяцюрнымі арт-аб'ектамі, але засталіся адным з запатрабаваных відаў турыстычнага сувеніра. Сёння мастацкая графічная паштоўка, якая распавядае аб гістарычнай і культурнай спадчыне, павінна адпавядаць некалькім крытэрыям: захаваць пазнавальнасць архітэктурнага вобраза, адпаведнасць формаў, колераў і графічных элементаў вобраза і ўдала ўпісацца ў сучасную прастору [5]. Гэтым крытэрам адпавядаюць беларускія паштоўкі, створаныя выдавецтвам адукацыйнага цэнтра "Лекторыум" (серыя "Гарады і вёскі Беларусі" з выявамі і згадваннямі асноўных гістарычных і сучасных славутасцяў кожнага краю) [4], а таксама па заказу кампаній OZ, "Офістон маркет" і прыватных выдавецтваў (паштоўкі з выявамі Траецкага прадмесця, Нацыянальнага мастацкага музея), на якіх прэзентаваны помнікі архітэктуры і іншыя артэфакты, уключаючы мастацтва выцінанкі і аб'екты сусветнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі (замкавы комплекс ў Міры, палацавы комплекс ў Нясвіжы, дуга Струве) [13].

Захоўваючы, ствараючы і прэзентуючы паштоўкі з выявамі значных месцаў і твораў культуры, мы распаўсюджваем інфармацыю аб культурнай спадчыне Беларусі, фарміруем у людзей пачуццё датычнасці і выхоўваем цікавасць да гісторыі і спадчыны сваёй краіны.


1. Богачева, О. Около 500 открыток с репродукциями работ Марка Шагала собрал витебский краевед. – URL: https://belta.by/culture/view/okolo-500-otkrytok-s-reproduktsijami-rabot-marka-shagala-sobral-vitebskij-kraeved-84880-2012/ (дата обращения: 04.09.2025).
2. Гаськова, А. В. Маладзечна на фотаздымках і паштоўках першай трэці XX стагоддзя [выяўленчы матэрыял] : [Камплект паштовак] / А. В. Гаськова. – Рыфтур прынт, 2014. – 13 л.
3. Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі : [сайт]. – URL: https://muzej.by/?p=945&lang=be (дата звароту: 12.09.2025).
4. Дэрр, А. Гарады і вёскі Беларусі. Гомель. [выяўленчы матерыял] : [паштоўка] / А.Дэрр. – Мінск : Адукац. цэнтр «Лекторыум», 2021. – 1 л.
5. Зингер, А. А. Анализ графических приемов, способных привлечь к проблеме историко-культурного наследия / А. А. Зингер // Культурное наследие и актуальные культурные практики: репрезентации, трансформации, перспективы: материалы Всероссийской (с международным участием) научно-практической конференции (Екатеринбург, 15–18 марта 2022 г.). – Екатеринбург: Издательство Уральского университета, 2022. – С 175–181.
6. Ларина, А. Н. Почтовая открытка в руках историка / А. Н. Ларина // Историк и художник. – 2004. – № 2. – С. 109–121.
7. Ліхадзедаў, У. А. Ад Віцебска да Полацка. Падарожжа ў часе [выяўленчы матэрыял] / У. А. Ліхадзедаў. – Мінск : Звязда, 2023. – 319 с. (У пошуках страчанага).
8. Малащенко, Л. И. Витебск на почтовых открытках XX в. из собрания Витебского областного краеведческого музея / Л. И. Малащенко // Віцебскі край : матэрыялы VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай Году гістарычнай памяці, 24 лістапада 2022 г., Віцебск / уклад. Л. І. Рагачова ; рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2023. – Т. 8. – С. 358–362.
9. Минск на старых открытках можно увидеть на выставке в столичной ратуше. – URL: https://belta.by/culture/view/minsk-na-staryh-otkrytkah-mozhno-uvidet-na-vystavke-v-stolichnoj-ratushe-519976-2022/ (дата обращения: 10.09.2025).
10. Морева, А. Запрашаем у Віцебск. [Выяўленчы матэрыял] : [паштоўка] / А. Морева. – Мінск : Адукац. цэнтр «Лекторыум», 2021. – 1 л.
11. Мы памятаем. Вялікая Айчынная вайна. 1941–1945 [выяўленчы матэрыял] : [Камплект паштовак]. – Рыфтур прынт, 2024. – 13 л.
12. На Дне письменности представили альбом «Ад Віцебска да Полацка. Падарожжа ў часе» Владимира Лиходедова // SB.BY. Беларусь сегодня. – URL: https://www.sb.by/articles/na-dne-pismennosti-predstavili-albom-ad-vitsebska-da-polatska-padarozhzha-chase-vladimira-likhodedov.html (дата обращения: 14.09.2025).
13. Падвербны, Ю. Дуга Струвэ [выяўленчы матерыял] : [паштоўка] / Ю. Падвербны. – Мінск : Адукац. цэнтр «Лекторыум», 2023. – 1 л.
14. Паўлава, А. Я. Паштоўкі ў асабістых зборах дзеячаў культуры Беларусі / А. Я. Паўлава // Веснік БДУКМ. Вып. 2(56). – Мінск : БДУКМ, 2025. – С. 115–126.
15. Подлипский, А. М. Белоруссия на почтовых открытках / А. М. Подлипский. – Минск : Полымя,1988. – 108 с .
16. Проект «Бацькаўшчына» презентовали сегодня на XXIX Минской международной книжной выставке-ярмарке. // SB.BY. Беларусь сегодня. – URL: https://www.sb.by/articles/proekt-batska-shchyna-prezentovali-segodnya-na-xxix-minskoy-mezhdunarodnoy-knizhnoy-vystavke-yarmark.html (дата обращения: 11.09.2025).
17. Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь : [сайт]. – URL: https://preslib.org.by/proekty (дата звароту: 23.08.2025).
18. Сакалоў, К. Е. Беларусь турыстычная [выяўленчы матэрыял] : [Камплект паштовак] / К. Е. Сакалоў. – Полікрафт, 2025. – 12 л.
19. Старажытныя гарады Беларусі. Полацк [выяўленчы матэрыял] : [Камплект паштовак]. – Рыфтур, 2018. – 13 л.
20. Уникальную «литературную коллекцию» формируют в библиотеке Борисова: авторские открытки, посвящённые известным белорусским писателям // ОНТ : [сайт]. – URL: https://ont.by/news/unikalnuyu-literaturnuyu-kollekciyu-formiruyut-v-kolodeevskoj-biblioteke-v-borisove-eto-avtorskie-otkrytki-posvyashyonnye-izvestnym-belorusskim-pisatelyam (дата обращения: 19.09.2025).
21. Хотянович, Н. А. Использование коллекции «Филокартия» в краеведческой деятельности: (из опыта работы ГУ «Лидский историко-художественный музей») / Н. А. Хотянович, // Краеведение: проблемы и перспективы развития в XXI веке : материалы научно-практической конференции с международным участием, посвященной 95-летию краеведческого музея Полоцка (Полоцк, 2–3 декабря 2021 г.) / [составитель И. П. Воднева]. – Полоцк, 2022. – С. 300–306.